# Дзяцінства, знявечанае вайной

## Дзіцячы дом “Крынкі”: старонкі гісторыі ваеннага часу



Дзіцячы санаторый “Крынкі”, пераважна туберкулёзнага профілю, размяшчаўся ў маляўнічым месцы на высокім левым беразе ракі Пціч, у былым маёнтку памешчыка Дарагана. Ён меў рэканструяваны двухпавярховы з мансардай вялізны мураваны будынак (галоўны корпус). Першы паверх займалі: гардэроб, сталовая, кухня, кабінет галоўнага ўрача, канцэртная зала, другі і трэці паверх – спальні і класы для заняткаў. Санаторый меў драўляны дзіцячы корпус, кацельню, воданапорную вежу, млын, рухавік для напампоўвання вады і выпрацоўкі электраэнергіі, лазню, пральню, школу, царкву, часоўню, жыллё для персаналу, вялізны сад, агароды, жывёльны двор, склады і іншыя дапаможныя пабудовы. Побач быў мост праз раку Пціч.

У санаторыі працаваў шматлікі абслуговы персанал: урачы, выхавальнікі, медсёстры, нянькі і г.д. Папраўляць здароўе дзяцей сюды завозілі на 1,5 – 2 месяцы.

Напярэдадні вайны, у чэрвені, тут адпачывалі каля 450 дзяцей – 10 груп школьнікаў з 1 – 7 кл. па 35 – 40 вучняў у кожнай, каля 80 дашкалят (6 – 7 год). Па прыбыццю ўсіх дзяцей пераапраналі ў санаторнае адзенне белага колеру: штаны, рубашкі, піжамы, панчохі. Адзенне дзяцей здавалі на склад. Адпачываючы прымалі лячэбныя працэдуры, купаліся, хадзілі ў лес, на экскурсію ў бліжэйшыя вёскі.

Пачалася вайна.

Ужо на другі дзень вайны загадчыца (дырэктар) санаторыя дазволіла ўсім, хто старэй за 12 год, пайсці дамоў, што многія, калі ведалі, куды ісці і зрабілі. Усіх астатніх нікуды не пусцілі, чакаючы бацькоў. Але прыехалі далёка не ўсе. На трэці дзень вайны асноўная маса абслугоўваемага персаналу на чале з былым дырэктарам Клепчуком пакінула санаторый. Пайшло шмат выхавацеляў, медыкаў, павароў, нянечак. Засталіся толькі самыя смелыя людзі, у тым ліку загадчыца санаторыя, некаторыя ўрачы: зубны ўрач Якаўлева Тамара Паўлаўна, медсястра – Гурбо Надзея Міхайлаўна.

На шосты дзень спачатку вайны ў санаторыі з’явіліся немцы. Яны ў гэты ж дзень расстралялі загадчыцу Шапіра (яўрэйку) і некаторых іншых работнікаў яўрэеў, хто не захацеў хавацца. Сабраўшы ўсіх дзяцей каля галоўнага корпуса, ім пад страхам пакарання забаранілі пакідаць тэрыторыю санаторыя.

Пад час акупацыі ў в.Крынка, што размяшчалася ў 2 – 3 км ад санаторыя, знаходзіўся цэнтр Крынкаўскай воласці са сваёй паліцэйскай службай, што ўваходзіла ў Старадарожскі раён. Бургамістрам Крынкаўскай воласці быў Балоцька, а за тым Ус. Аднак Крынкаўская сельуправа і дзіцячы дом “Крынкі”, створаны на базе санаторыя, падпарадкоўваліся Асіповіцкаму раёну (бургамістр Гаранін). Акупацыйныя ўлады не выпадкова рашылі ў гэтым месцы арганізаваць дзіцячы дом, сабраць тут дзяцей з усіх падобных устаноў Асіповіччыны. Галоўнае, што месца тут было вельмі ўжо ціхае, закрытае ад чужых вачэй. Да бліжэйшай чыгуначнай станцыі Дараганава – 6



км., да вёскі Крынка – 3 км., да невялікай вёсачкі Камарына – 1 км., да шашы Асіповічы – Бабоўня – 4 км.

З прыходам новай улады былі прызначаны новыя выхавацелі, повары… Аднавілі забеспячэнне санаторыя хлебам. Яго прывозіў возчык-яўрэй. Пазней ён быў расстраляны. Астатнія прадукты былі свае – санаторныя. На дзяцей ўсклалі абавязкі па абслугоўванню: прыбіранне памяшканняў, забеспячэнне вадой з рэчкі, бо вадакачка ўжо не працавала, мыццё посуду, нарыхтоўка дроў і інш. Спачатку пускалі крыху і пагуляць, але толькі ў межах санаторнага парку. Кармілі ўжо значна горш, але яшчэ больш-менш цярпіма. Да канца жніўня колькасць дзяцей зменшылася, бо зрэдку яшчэ да некаторых з іх дабіраліся бацькі і забіралі дамоў. Па ўспамінах Свярдлова У.С., амаль ніхто не прыехаў за яўрэйскімі дзецьмі, а іх было там шмат, каля сотні. Пазней з Асіповічаў прывезлі яшчэ 40-50 яўрэйскіх дзяцей. Усім ім загадалі нашыць на адзенні шасціканцовыя зоркі з жоўтай тканіны спераду і ззаду на спіне, насупраць сэрца. Пасля падзялілі на чатыры групы: дзве хлопчыкаў і дзве дзяўчынак, прыкладна па 35 чалавек кожная, і пасялілі ў галоўным корпусе на другім паверсе. Да дзяўчынак і хлопчыкаў прыставілі па выхавацельніцы (25 – 30 год – яўрэек). Выхавацельніцу хлопчыкаў звалі Хана. Яны вадзілі іх у сталовую, выдавалі хлеб, размяркоўвалі работы. Вось і ўсе іх кантакты з выхаванцамі. Яўрэйскім дзецям патлумачылі, што яны людзі ніжэйшага гатунку, проста “жыды”, і што цяпер яны павінны рабіць усё, што загадаюць. З гэтага моманту іх жыццё ператварылася ў пекла. Яны павінны былі прыбіраць усе туалеты, як унутры будынка, так і на вуліцы, пакоі, сталовую, цягаць ваду з рэчкі для ўсяго санаторыя, калоць дровы. Карміць сталі значна горш. А пасля медагляду, праведзенага ў верасні нямецкімі ўрачамі, харчаванне пагоршылася яшчэ больш. Сталі карміць



толькі 2 разы на дзень. Хлеба сталі даваць 100г. у суткі. Кармілі толькі бульбай, буракамі і капустай без усялякіх тлушчаў, чай і кампот спынілі даваць, далей паілі толькі кіпнем. Старэйшыя пачалі адбіраць ежу ў малодшых. З'явіліся лідэры. Сярод яўрэйскіх быў хлопец Яша – 12-ці гадоў, якога пачалі ўсе слухацца.

Падчас прыбірання парка дзеці збіралі насенне клёна, вымалі зярняткі і елі іх. Елі таксама серцавіну аера, калі насілі ваду з рэчкі. Гульні былі забыты. Усе думкі дзяцей былі толькі пра ежу.

Адзенне з белага ператварылася ў цёмна-шэрае, хаця калі-некалі дзеці мылі яго самі без мыла. Саміх памылі першы раз праз тры месяцы з пачатку вайны. Мыла і рушнікоў не было. Выдалі па аднаму тазіку цёплай вады. Знешне дзеці выглядалі як дзікуны: іх ніхто не падстрыгаў, на іх было ірванае адзенне. Калі восенню захаладала, па іх просьбе выдалі тую вопратку, з якой яны прыехалі ў санаторый. Але ж яна была ў асноўным летняя. Напрыклад, у Валодзі Свярдлова былі кароткія штаны (шорты) на шлейках, дзве рубашкі, летняе паліто, сандалі, бацінкі з галошамі, дзве пары панчохаў і кепка. А ў многіх і гэта адзенне было скрадзенае.

Тэрыторыя санаторыя ахоўвалася. Паліцэйскія кругласутачна неслі каравул. Яны былі ўзброены вінтоўкамі і плёткамі. Адзін з іх, старшы, гадоў 35-40, быў сапраўдны садыст. Вінтоўку ён не насіў, затое плётка ў яго была адметная: у кавалак гумавага шланга быў устаўлены стальны расплецены трос, дыяметрам 8 – 10 мм, даўжынёй 40 – 45 см. Ім ён і біў дзяцей без усякай нагоды.

Калі паспеў ураджай, усіх, нягледзячы на ўзрост дзяцей, пагналі на ўборку буракоў, а потым капусты. Для малалетак гэта была вельмі цяжкая работа. Пры гэтым іх пастаянна збівалі. Затое ў час уборкі дзеці сталі крыху

меней галадаць, бо елі сырую гароднiну. Пазней яны называлi гэты перыяд раем.

У перыяд с кастрычнiка да снежня немцы звезлi сюды дзяцей з усiх дзiцячых дамоў Асiповiччыны: Лапiчаў, Карытнага, Свiслачы, Дараганава, Асiповiчаў. З гэтага моманту становiшча яўрэйскiх дзяцей яшчэ больш пагоршылася. Дзетдомаўцы, якiя самi знаходзiлiся ў не намнога лепшых умовах, спаганялi сваю злосць на мясцовых. Яны ўрывалiся ў пакоi, дзе жылi санаторныя дзецi, моцна збiвалi iх, адбiралi ў iх адзенне i абутак, коўдры i падушкi. Абслуга ўмешвацца не жадала цi то баялася, а палiцаi нават заахвочвалi такiя дзеяннi, нацкоўвалi на дзяцей яўрэйскай нацыянальнасцi.

Пасля заканчэння ўборкi ўраджаю да голаду дабавiўся холад. Ужо ў лiстападзе пачалiся моцныя маразы. Будынак амаль не ацяпляўся, печкi былi вялiкiя, на два пакоi, а дроў яўрэйскiм дзецям дазвалялi браць толькi па тры палены, даўжынёй каля 1 м на тры днi. За гэтым строга сачылi палiцаi. Вокны ў пакоях забiлi дошкамi, святло амаль не трапляла туды. Iншы раз дзецi страчвалi пачуццё часу. Замест раскладушак на падлогу насцялiлi лiсце, пазней салому, бо не хапала месца. Спалi ў адзеннi. Ад холаду не было выратавання. Цяплей было толькi ў днi, калi адлiга супадала з прапальваннем печак. У пакоях быў бак з вадой i начны посуд, бо ноччу нiкуды не выпускалi, дзверы запiралi i дзяжурылi ахоўнiкi.

Цяжкай працай стала ачыстка ад снегу i падрыхтоўка вады з рэчкi. Трэба было прабiваць тоўсты лёд i па жывому ланцугу падаваць ваду на высокi бераг. Рабiць усё гэта даводзiлася без рукавiц i цёплага абутку. Пачалiся абмаражэннi рук i ног, а медыкаментаў нiякiх ужо не было.

З тыльнага боку будынка была да вайны прыбудавана кухня. На вулiцы каля яе стаяла вялiзная скрыня для харчовых адыходаў, i тыя, хто працавалi на двары, iмкнулiся патрапiць туды, каб падабраць ачысткi ад бульбы i буракоў, капусныя качарыжкi. Здабыткам трэба было потым дзялiцца з тымi, хто не рабiў на вулiцы. Калi дзяцей заўважалi за гэтым заняткам, iх жорстка збiвалi. Аднойчы за гэта збiлi Валодзю Свярдлова да страты прытомнасцi i ён не мог падняцца з падлогi тры днi.



Зiмой сярод дзяцей пачаўся мор. Першымi сталi памiраць дзяўчынкi, затым i хлопчыкi. Памiралi цiха, у сне, па 2-3 чалавекi ў тыдзень. Памiралi ад хвароб (тыф, дызентэрыя, дыстрафiя).

Асабліва шмат памерла дзяцей у студзені 1942 года. Жораў Коля, які працаваў у кацельні, сам бачыў, як зімой складваліся замерзлыя трупы каля “ціфозніка” (барака для хворых дзяцей), а потым паліцаі баграмі спіхвалі іх пад лёд.

Перад новым 1942 годам дзяцей памылі ў лазні другі раз з пачатку вайны. Перад мыццём загадалі вычэсваць з галоў вошы на двары. Ад іх снег стаў навокал шэрага колеру.

Успамінае Валодзя Свярдлоў: “Наступіла поўная апатыя да жыцця. Ужо нічога не хацелася – ні есці, ні піць, ні жыць. Галава ўжо мала што разумела. Калі выводзілі на вуліцу на работу, перад вачыма ўсё мільгацела, і было толькі адно-адзінае жаданне: хутчэй бы ўсё закончылася, як скончылася для многіх тых, каго не было ўжо сярод нас.”

Дзеці не яўрэйскай нацыянальнасці мелі крыху больш вольнасцей і нават пакідалі тэрыторыю лагера, хадзілі папрашайнічаць па вёсках ці абменьваць адзенне, бялізну на прадукты. Іншы раз гэта ўдавалася. Аднак за адлучку, калі хто пападаўся, жорстка каралі. Адным з пакаранняў быў карцэр.

На працягу 1941 года ў санаторый траплялі шматлікія групы акружэнцаў Чырвонай Арміі і адзінокія салдаты і афіцэры, якія сталі пазней асновай некаторых партызанскіх атрадаў. Частка персаналу санаторыя, што засталася, стала актыўна дапамагаць ім. Адной з такіх была і маладая доктар – стаматолаг Тамара Паўлаўна Якаўлева, член партыі, член атрада акружэнцаў пад кіраўніцтвам Мілевіча Аляксандра Восіпавіча (клічка Маліноўскі). Такіх невялічкіх атрадаў вакол санаторыя было некалькі. Лагер Маліноўскага размяшчаўся за 3 км ад санаторыя недалёка ад вёскі Халькі, у лесе на балоце. Якаўлева Т.П. была вельмі смелая, рухавая і баявая жанчына. Яна дапамагла не аднаму чырвонаармейцу: карміла, перавязвала. У санаторый ў ліпені-жніўні часта наведваліся карныя атрады, “госці”, і Тамара Паўлаўна заўсёды выручала партызан. Але аднойчы ў яе дома (яна жыла на тэрыторыі санаторыя) знайшлі воіна-акружэнца, а ў печы - наган. За гэта яе расстралялі 17 верасня 1941 года ў 7 гадзін раніцы (паводле Мілевіча А.І). За дапамогу партызанам прадуктамі быў расстраляны механік санаторыя Левіцін разам са старшым сынам – Якавам (16 год).

Калі ў санаторыі з’явіліся дзетдомаўцы, партызаны ўстанавілі з імі сувязь, і дзеці паведамлялі ім аб небяспецы. Партызаны ў сваю чаргу дапамагалі каланістам. Так звалі мясцовыя жыхары ўсіх дзяцей, што знаходзіліся ў санаторыі. За жорсткае абыходжанне з дзецьмі яны аднойчы, па падказцы дзетдомаўцаў, захапілі аднаго з найбольш злых паліцаяў і расстралялі ў 2 км ад лагера. Немцы за паліцаяў не помсцілі, і пасля гэтага выпадку паліцаі сталі больш лагоднымі – баяліся (з успамінаў Жарава М.В.)

10 кастрычніка 1941 года немцы прызначылі новага дырэктара (загадчыка) дзіцячага дома – Шыпенка Пятра Данілавіча. Перад вайной ён меў званне маёра, служыў начальнікам хімічнай службы асобнай танкавай дывізіі. 29 чэрвеня 1941 года пад Мінскам трапіў у палон, з якога збег на другі ж дзень. Знішчыў дакументы і партбілет, наўмысна застаўся у акупацыі. Вярнуўся да сябе ў вёску Старае Сяло Асіповіцкага раёна.

Дырэктарам дзетдома “Крынкі” быў да кастрычніка 1942 года. Пазней шмат разоў арыштоўваўся, але вызваляўся, пасобнічаў акупантам. Па яго падказцы было арыштавана 30 савецкіх грамадзян. Быў членам і кіраўніком СБПБ (Саюз барацьбы супраць бальшавізму) у г.Асіповічы. Быў у пэўны час у Германіі, супрацоўнічаў з РОА і СД. У 1944 годзе зноў кіраваў дзіцячым домам ужо ў горадзе. 22.09.44 года быў асуджаны на 10 год пазбаўлення волі з паразай на 5 год і кансфіскацыяй маёмасці. Памёр у заключэнні 22.02.45 года. 30.06.1998 года абгрунтаванасць прыгавору была пацверджана пракуратурай РБ *(Кісялёў У.М. Архіўныя матэрыялы)*.

Пасля Шыпенкі П.Д. дырэктарам дзетдома “Крынкі” быў прызначаны Крынка Тарас, які пазней пайшоў у партызаны і загінуў у баі. Амаль адначасова з Шыпенкам П.Д. яго намеснікам па гаспадарчай частцы была прызначана Ждановіч Вера Пятроўна. Асоба вельмі супярэчлівая. Фактычна яна кіравала дзетдомам. Аб гэтым сведчыць і той факт, што іменна яе прозвішча часцей за ўсё спалучаецца з пасадай дырэктара мясцовымі жыхарамі.

Ждановіч В.П. – 1913 г.н., уражэнка г.Лібавы, руская, адукацыя сярэдняя, жонка афіцэра. Пражывала ў г.Асіповічы, вул. Першамайская д.9, прафесія – бухгалтар. Мела дваіх уплывовых братоў.



Дзяцей выхоўвала ў прафашысцкім духу. Арганізавала два канцэрты дзіцячага хору – 20 чалавек, які выступаў у клубе чыгуначнікаў у Асіповічах з прафашысцкімі песнямі для афіцэраў нямецкага гарнізона, а таксама ў дзіцячым доме. Дзяцей са сцэны прымушала ў канцы выступленняў крычаць “Хайль Гітлер!”. Нямецкія песні вучылі з патэфона. П’есу “Снягурачка” пераклалі на нямецкую мову.

Асноўнай мерай пакарання быў карцар, які арганізаваў Шыпенка па ініцыятыве Ждановіч. Ён размяшчаўся на трэцім паверсе, не ацяпляўся. Сядзець можна было толькі на бетоннай падлозе. Да выхаванцаў адносілася бесчалавечна.

Саджалі сама меней на суткі. Пакараных кармілі самі дзеці. Пасля карцара памёр у 1942 годзе Асмалоўскі Саша, 12 год. Раскіну Розу трымалі двое сутак у халодным умывальніку, захварэла, яе расстралялі. Зімой 1942 года партызаны разламалі дзверы карцара, але потым іх адрамантавалі і абабілі жалезам.

Галасевіча Івана Ждановіч пасадзіла на 12 сутак за тое, што ён даў дзецям бульбу, звараную для свіней.

Ждановіч забараніла пячы бульбу ў печках. Дзеці ненавідзелі яе і паміж сабой называлі “немкай”. Вясной 1942 года яна прысвоіла дзетдомаўскую карову Ластаўку, забараніла яе даіць, а потым забіла на мяса. Дзяцей-энурэзнікаў трымалі ў халодных пакоях і давалі нягодныя матрасы. Некаторых захварэўшых дзяцей па рэкамендацыі ўрача Саўчанкі А.Р. адпраўлялі ў райбальніцу, дзе іх расстрэльвалі. Так зрабілі з Вольскім Вовам – 14-16 год, вельмі начытаным, але са слабым здароўем.

Успамінае Ісхановіч Віктар Анатольевіч, былы выхаванец Дараганаўскага дзетдома з 1938 года, які зараз пражывае ў г.Звянігарадзе Маскоўскай вобласці:

«На память приходит красивое место. Вокруг никого не было, и мы были в изоляции. Нас нагнали более 500 ребят. У нас работало 4 взрослых, остальные работы выполняли дети. Мы были от 2 до 16 лет … Нам стали давать продукты: обрат, 100 г. хлеба, 5 г. растительного масла. Я уже не помню нормы, но основное, картошка, которую выращивали сами.

Зима 1942 год. Однажды ночью, пришли вооружённые люди, собрали парней повзрослее и спросили: «Кто хочет идти в партизаны?» Желание изъявили 11 или 12 ребят. И они уехали. Днём заявились немцы, и сообщили нам, чтобы мы закопали своих партизан, что мы и сделали. После этого они усилили за нами контроль… Через шесть месяцев приехал отряд немцев. Они отобрали около ста ребят… в Германию. После этого совсем перестали отпускать продукты. Нас выручало попрошайничество. Ещё нам помогала церковь, которая находилась на нашей территории… Я лично был в команде по обеспечению дровами всех помещений. До сих пор помню норму на одну печь – 10 поленьев, а их было более 60 печей…»

Аднак ці не самым жудасным быў растрэл яўрэйскіх дзяцей (82-86 чалавек) вясной 1942 года.

У красавіку 1942 года бургамістр Дараганаўскай воласці Балоцька па загаду немцаў і начальніка Крынкаўскай паліцыі Ерашэвіча прыехаў на дзвюх падводах у дзіцячы дом з групай узброеных паліцэйскіх і немцаў (16 чалавек) з Дараганаўскай паліцыі. Частка паліцэйскіх і немцаў акружылі корпус, а астатнія ўвайшлі ўнутр. Усіх дзяцей, каля 300 чалавек і абслуговы персанал сабралі ў агульную залу на другім паверсе быццам бы для медыцынскага агляду. Па спісу, складзеным Ждановіч, які зачытваў Балоцька, выхавацелі з сваіх груп аддзялялі яўрэйскіх дзяцей ад іншых – усяго 82 чалавекі. Дзве дзяўчынкі – Фрындлянд Валя і Віннік Рая – самавольна пайшлі і схаваліся ў адным з пакояў. Выхавацельніца Марачкіна і Ждановіч вярнулі дзяцей у залу.

Акрамя дарослых, былі сабраны яўрэйскія дзеці ясельнага ўзросту (15 чалавек). Дзецям сказалі, што ў в.Крынка іх пасадзяць на машыны і перавязуць у г.Бабруйск, у дзетдом для дзяцей яўрэйскай нацыянальнасці. У залу выклікалі таксама прафесара – рэнтголага Рохліну Марыю Ісакаўну (65 – 70 год, яўрэйка), ясельную сястру Дрон Тамару (30 год, яўрэйка),

медыцынскую сястру Марыю (яўрэйка, 35 год). Апошнюю пакідалі ў зале, бо яна была польскай яўрэйкай, прыняўшай каталіцтва, але ў страі быў яе дзесяцігадовы сын, і яна, каб выратаваць яго, ірвалася ў калону. Паліцэйскія адштурхоўвалі яе і білі прыкладамі. Тады яна сама стала ў калону побач з сынам.

Усіх адабраных вывелі на двор з рэчамі і чамаданчыкамі, у каго яны былі. Там іх пастроілі ў калону па 2 чалавекі, і паліцаі пад зброяй павялі дзяцей у накірунку в.Крынка. Дзяцей ясельнага ўзросту пасадзілі на падводы. Па дарозе на в.Крынка уцёк у прыдарожны сасоннік Валодзя Свярдлоў. Старэйшы за яго Яша здагадаўся, куды іх вядуць, і падзяліўся думкай з Валодзем. Аднак сам уцякаць не рашыўся. Бо не ведаў куды падацца потым.

Як успамінае Валодзя Свярдлоў, ён доўга блукаў па лесе, пакуль не трапіў у в.Краі. Зашыўся ў хлеў, дзе елі свінні, і наеўся таго, што засталося ад іх. Там яго знайшоў гаспадар, які накарміў, напаіў, пераапрануў і правёў да вёскі Каўгары, дзе яго каля двух тыдняў хавалі, памылі, падстрыглі і падлячылі раны дзве жанчыны, а потым адправілі далей на в.Буда.

Доўга, амаль усё лета блукаў ён па навакольным лясам. Зрэдку заходзячы ў вёскі, каб паесці. У рэшце рэшт ён захварэў і страціў прытомнасць. У гэты час яго знайшла жанчына – Звонік Аляксандра Кірылаўна, з вёскі Макарычы, што непадалёк ад горада Старыя Дарогі. Яна забрала яго да сябе і хавала да канца вайны. Зараз ён жыве ў Мінску.

Дзяцей прывялі на ўскраек лесу за в.Крынка ў 1 км ад дарогі Асіповічы – Бабоўня. Там іх ужо чакалі немцы і вырытая крынкаўскімі жыхарамі яма. Двое немцаў падводзілі дзяцей групамі па 8-10 чалавек і кідалі іх, плачучых і просячых міласці, у яму, а трэці немец з аўтамата расстрэльваў іх. Расстраляўшы дарослых жанчын і падлеткаў, паліцаі падвезлі на падводах дзяцей 1-2 гадоў да той жа ямы і пакідаўшы іх туды, тут жа расстралялі. Затым яны селі ў чакаўшую іх машыну і паехалі. Засыпаць магілу прымусілі выхаванцаў: Ісхановіча Віцю, Сашу і Барыса (прозвішчы невядомы), з-за чаго першага з іх пасля вайны выклікалі ў органы СМЕРШ як сведку.



Гэтага расстрэлу пазбег спачатку таксама яўрэйскі хлопчык Гурэвіч Ізя (10-12 год). Аб предстаячай акцыі яго папярэдзіў сын Шыпенкі, Уладзік (12 год). Ізя спачатку адну ноч хаваўся у лесе, а затым, у дзень расстрэлу, вечарам вярнуўся ў дзіцячы дом і схаваўся на гарышчы. Па адных звестках Ждановіч сама выдала яго праз два дні, па іншых-жа быццам бы прыехаўшы на трэці дзень таго жудаснага злачынства ў дзетдом бургамістр Гаранін выпадкова заўважыў хлопчыка і забраў яго з сабою ў Асіповічы, дзе яго потым і расстралялі.

У 1942 годзе немцы часцяком наведваліся ў лагер і адбіралі найбольш падыходзячых дзяцей для вывазу ў Германію. Іх падкармлівалі, лепш апраналі. Такіх вывазаў з "Крынкі" было тры. Колькі было вывезена дзяцей, дакладна ўстанавіць пакуль не ўдалося, па розных сведчаннях, ад 30 да 100 чалавек. Частка з іх трапіла ў дзетдом г.Рэтцаў у так званую школу "Эсесхаймшуле", дзе з іх перыядычна бралі кроў. У адзін з вывазаў і трапіў Жараў Коля. Яго, разам з дзесяткам іншых дзяцей, памылі, накармілі, пераапранулі ў лепшую вопратку і з горада Асіповічы адправілі ў Германію. На станцыі Баранавічы немцы адправілі яго з сябрам Лёшам за кіпнем. Там сабралася вялікая чарга. Пакуль яны дачакаліся, эшалон пайшоў. Так ён застаўся ў Беларусі на волі, жывы.

У студзені – сакавіку ( па некаторых звестках восенню 1943 года) дзяцей з "Крынкі" па загаду галавы раёна Мазалеўскага перавезлі ў Асіповічы і размясцілі ў двухпавярховым будынку каля чыгуначнага пераезду. Прычынай перавозу дзяцей ў горад быццам бы стала тое, што ў студзені 1943 года частка работнікаў пайшла ў партызаны. І ўвогуле дзетдом апынуўся ў зоне іх дзеянняў. У тым жа годзе яго яшчэ двойчы пераводзілі ў іншыя месцы Асіповічаў (у паўднёвы, паўночны гарадок), потым у школу на акраіне горада. Немцам патрэбна было ўзяць яго пад свой кантроль. У час знаходжання дзіцячага дома на новым месцы аднойчы яго наведалі партызаны з атрада Ліванцава і забралі прыкладна 18 пудоў солі, каля 90 штук марлевых занавесак, бінты, каня і калёсы. (Паводле матэрыялаў допытаў і ўспамінаў Ісхановіча В.А.)

На працягу ўсёй вайны лагер у былой сядзібе Дараганаў называлі хто дзіцячым домам, хто санаторыям, хто і проста калоніяй, а дзяцей каланістамі. Аднак, тыя, хто сам пераэжыў гэта пекла, лічаць, што гэта быў сапраўдны лагер малалетніх вязняў для часовага іх утрымання і далейшага размеркавання для патрэб рэйха.

За доўгія ваенныя гады, дзеці, ад малых да старэйшых школьнікаў, спаўна зведалі ўсе яе жахі. Бо вайна ў сотні разоў страшней, калі бачыць яе дзіцячымі вачыма ... І ніякі час не зможа вылечыць раны ад вайны, тым больш дзіцячыя. «Гэтыя гады, што былі калісьці, горыч дзяцінства забыць не дае ...»